Прамова тав. К. Т. Мазурава

Старшыня Совета Міністраў БССР

Таварышы! Кампартыя Беларусі да свайго XXI з'езда прышла яшчэ больш арганізацыйна ўзмацнеўшай, маналітнай і цесна згуртаванай вакол Цэнтральнага Камітэта нашай партыі.

Ажыццяўляючы велічную праграму сацыялістычнага будаўніцтва, выпрацаваную XIX з'ездам КПСС, Кампартыя Беларусі дабілася значных поспехаў у развіцці народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

ЦК КПБ і Совет Міністраў [illegible] клопаты аб росце прамысловасці ў рэспубліцы і, у прыватнасці, на [illegible] шынабудавання, якое [illegible] базу для ўздыму ўсіх галін гаспадаркі. Пры [illegible] ўсёй прамысловасці вырасці ў 1953 годзе на 18 працэнтаў, у тым ліку машынабудавання — на 42,6 працэнта.

Многа ўвагі ўдзялялася развіццю прамысловасці, якая выпускае тавары народнага спажывання. Калі ў 1952 г. выпуск прадукцыі гэтай галіны ўзрос на 12,7 працэнта, то ў другім паўгоддзі 1953 года—на 19,8 працэнта.

Пад пастаянным кантролем знаходзіліся паліўная прамысловасць, энергетыка, прамысловасць будаўнічых матэрыялаў. У развіцці гэтых галін дасягнуты пэўныя поспехі. Аднак тэмпы іх развіцця ўсё яшчэ адстаюць ад пастаянна растучых патрэбнасцей народнай гаспадаркі рэспублікі.

Паліўная прамысловасць рэспублікі далёка не забяспечвае патрэбнасці нават прамысловай вытворчасці, не гаворачы ўжо аб патрэбах насельніцтва. Совет Міністраў распрацоўвае мерапрыемствы, ажыццяўленне якіх дасць магчымасць поўнасцю вырашыць паліўную праблему ў рэспубліцы.

У нас яшчэ адстае энергетыка. Дзякуючы прымаемым мерам, у новай пяцігодцы выпрацоўка электраэнергіі на душу насельніцтва павялічыцца ў рэспубліцы больш чым у 2 разы.

Сур'ёзна адстае ў сваім развіцці прамысловасць будаўнічых матэрыялаў як па колькасці вырабляемых матэрыялаў, так па асартыменце іх якасці. Тав. Ісідараў, выступаючы [illegible] на з'ездзе, крыху згусціў фарбы, гаворачы аб цяжкасцях і аб'ектыўнасці. Зразумела, цяжкасці [illegible] чараніцы матэрыялаў не выконваецца вынікам неарганізаванасці і няздагадлівасці кіраўніцтва прадпрыемствамі з боку міністэрства.

Яшчэ нізкія якасныя паказчыкі работы многіх прамысловых прадпрыемстваў.

Пры выкананні плана прамысловай вытворчасці ў цэлым прамысловасць рэспублікі дрэнна выконвае план па відах прадукцыі. У 1953 годзе прамысловыя прадпрыемствы толькі пяці рэспубліканскіх міністэрстваў не выканалі планы па 105 назвах галоўнейшых відаў вырабаў.

У нас выпускаецца значная колькасць тавараў нізкай якасці. Толькі па Міністэрству мясцовай і паліўнай прамысловасці страты ад браку склалі ў 1953 годзе больш мільёна рублёў. Вялікія страты ад браку і нізкай якасці прадукцыі ёсць таксама і ў іншых галінах прамысловасці.

Адным з важнейшых паказчыкаў работы прамысловасці з'яўляецца павышэнне

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

прадукцыйнасці працы. У 1953 годзе прадукцыйнасць працы рабочых у параўнанні з 1952 годам у цэлым па рэспубліцы, без саюзнай прамысловасці, вырасла на 9 працэнтаў. Аднак план росту прадукцыйнасці працы выканан толькі на 99 працэнтаў.

Якія вялікія рэзервы для павышэння прадукцыйнасці працы ёсць у нашай прамысловасці, паказваюць наступныя даныя. У 1953 годзе прадпрыемствамі саюзна-рэспубліканскіх і рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў план першага квартала быў выканан на 95,2 працэнта, у той час як план чацвёртага квартала перавыканан на 9,1 працэнта.

На многіх прамысловых прадпрыемствах рэспублікі ў запушчаным стане знаходзіцца нарміраванне працы. Удзельная вага тэхнічна абгрунтаваных норм вельмі нізкая, пераважаюць вопытна-статыстычныя нормы, складзеныя без уліку дасягнутага ўзроўню тэхнікі і росту кваліфікацыі рабочых.

Сабекошт у цэлым па прамысловасці рэспубліканскага падпарадкавання зніжан на 6,4 працэнта замест 6,7 працэнта па плану, у выніку чаго недаатрымана каля 19 мільёнаў рублёў эканоміі.

Барацьба за высокія якасныя паказчыкі работы прамысловасці—гэта і ёсць барацьба за выкарыстанне дадатковых рэзерваў для павелічэння выпуску тавараў народнага спажывання. Але ёсць у нас нямала гаспадарнікаў, якія не разумеюць гэтага. Гэта адсталыя, косныя людзі, якія чапляюцца за старое, не жадаюць ўкараняць у вытворчасць усё прагрэсіўнае і перадавое. Неабходна зламаць гэтую касность, падцягнуць адстаючыя прадпрыемствы, забяспечыць выкананне планаў не толькі па аб'ёму, але і па якасных паказчыках кожным прадпрыемствам.

Буйныя недахопы ёсць і ў рабоце будаўнічых арганізацый. Нашы будаўнікі штогод недаасвойваюць значныя сумы капіталаўкладанняў, будуюць дорага і ў многіх выпадках нядобраякасна.

Можна назваць і іншыя буйныя недахопы ў развіцці гаспадаркі рэспублікі. Напрыклад, у нас дрэнна працуе аўтамабільны транспарт. У многіх аўтагаспадарках з году ў год не выконваюцца каэфіцыенты выкарыстання аўтапарку і нормы прабегу. Грузавы аўтапарк распылен на дробных аўтагаспадарках, што зніжае яго эксплуатацыйныя паказчыкі.

У рэспубліцы няма дастатковай рамонтнай базы для аўтамабільнага парку. Міністэрства аўтамабільнага транспарту і шасейных дарог БССР не праяўляе неабходных клопатаў аб стварэнні гэтай базы. Асабліва нездавальняюча ўтрымліваецца аўтатранспарт у калгасах, прычым Міністэрства сельскай гаспадаркі стаіць у баку ад гэтай справы.

У дрэнным стане знаходзяцца ў нас дарогі, асабліва рэспубліканскага і мясцовага значэння.

Ёсць буйныя недахопы і ў галіне, і ў народнай асвеце, і ў рабоце культурна-асветных устаноў, і ў ахове здароўя. Міністэрства аховы здароўя, напрыклад, слаба кіруе ўсёй санітарную работу ў рэспубліцы. Нездавальняюча ідзе будаўніцтва курортаў і рэспубліканскіх санаторыяў, хоць у нас ёсць для гэтага вялікія магчымасці. Над усімі гэтымі пытаннямі працуе ў сучасны момант Совет Міністраў БССР.

Аднак усе гэтыя недахопы і нявырашаныя задачы ў прамысловасці і ў іншых галінах гаспадаркі рэспублікі не патрабуюць столькі ўвагі, сіл і сродкаў, колькі патрабуе сельская гаспадарка. Недапушчальна дрэнна вырашаюцца ў рэспубліцы пытанні развіцця сельскай гаспадаркі. Многія з нашых кіруючых работнікаў не востра крытычна ацэньваюць становішча спраў у сельскай гаспадарцы. Штогадовае атрыманне нізкіх ураджаяў сельскагаспадарчых культур у калгасах яны ўсякі раз прабуюць вытлумачыць неспрыяльнымі ўмовамі. Няправільна гэта, таварышы. Пры сучасным тэхнічным узбраенні, пры правільным выкарыстанні дасягненняў аграномічнай навукі ўплыў прыроды на ўраджай перастае быць рашаючым. Галоўнай умовай атрымання ўраджаю становіцца ўзровень арганізацыі калгаснай вытворчасці.

Прычыны адставання сельскай гаспадаркі ў рэспубліцы трэба шукаць у нізкім узроўні арганізацыйнага кіраўніцтва машынна-трактарнымі станцыямі і калгасамі.

Вераснёўскі Пленум ЦК КПСС распрацаваў праграму крутога ўздыму адстаючых галін сельскай гаспадаркі, запатрабаваў ад партыйных, совецкіх і сельскагаспадарчых органаў карэннай перабудовы кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, ліквідацыі абязлічкі і безадказнасці за стан спраў у калгасах і МТС.

Дзякуючы палітычнай і арганізатарскай рабоце партыйных арганізацый па выкананню рашэнняў вераснёўскага Пленума ЦК КПСС у нас прыкметна павысілася палітычная і вытворчая актыўнасць калгаснікаў і механізатараў. Гэта дало магчымасць больш паспяхова завяршыць сельскагаспадарчы год. У рэспубліцы ў 1953 годзе вырасла колькасць перадавых калгасаў, якія вядуць гаспадарку па-новаму. Калгаснікі больш пачалі праяўляць ініцыятывы ў развіцці высокадаходных галін грамадскай гаспадаркі. У 1953 годзе былі некаторыя поспехі ў развіцці ільну і канапель, дзякуючы чаму рэспубліка ўпершыню за ўсе гады выканала дзяржаўны план нарыхтовак ільнопрадукцыі і пянькі.

Усё гэта сведчыць аб тым, што ў нас створаны ўсе ўмовы для паспяховага ажыццяўлення праграмы ўздыму сельскай гаспадаркі, распрацаванай вераснёўскім Пленумам ЦК КПСС, і яна будзе выканана

Аднак гэтыя поспехі не могуць засланіць надзвычайна цяжкага становішча ў многіх МТС і калгасах. У 1953 годзе калгасы рэспублікі ў цэлым атрымалі нізкія ўраджаі збожжа, асабліва жыта, а таксама бульбы, не выканалі плана паставак збожжа і бульбы дзяржаве.

У многіх калгасах і ў 1953 годзе мала выдана збожжа і бульбы на працадні калгаснікам, асабліва ў Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях.

Рэспубліка не выканала план развіцця грамадскай жывёлагадоўлі, асабліва па матачнаму пагалоўю. У чацвёртым квартале дапушчаны страты грамадскай жывёлы.

У 1953 годзе Беларусь не выканала дзяржаўнага плана паставак прадуктаў жывёлагадоўлі. У першым квартале 1954 года калгасы таксама нездавальняюча выконваюць заданні па пастаўках гэтых прадуктаў.

Мы добра ўсведамляем тое, што рашэнні вераснёўскага Пленума ЦК КПСС не маглі мець уплыву на ўраджай 1953 года, але дырэктывы Пленума павінны былі аднаведным чынам садзейнічаць правядзенню зімоўкі жывёлы, выкананню абавязацельстваў па пастаўках сельгаспрадуктаў і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы 1954 года. Аднак у многіх калгасах прыкметнага паляпшэння спраў яшчэ не наступіла. Многія калгасы да гэтага часу не засыпалі насення збожжавых, тэхнічных культур, бульбы і траў над яравую сяўбу 1954 года. План выразкі гною на 10 лютага выканан толькі на 30 працэнтаў, а торфу— на 41 працэнт.

ЦК КПБ і мясцовыя партыйныя органы правялі вялікую работу па ўмацаванню МТС і калгасаў кадрамі. Аднак нерабудова работы партыйных, совецкіх і сельскагаспадарчых органаў па кіраўніцтву сельскай гаспадаркай у духу патрабаванняў ЦК КПСС у нас зацягнулася. Шматлікія кадры партыйных работнікаў, інжынераў і тэхнікаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, пасланых у МТС, яшчэ на сутнасці толькі прыступаюць да работы. Кіруючыя органы рэспублікі і абласцей мала аказваюць ім дапамогі.

Адна з самых важных нашых задач заключаецца ў тым, каб хутчэй укамплектаваць усе МТС кадрамі, дапамагчы ім хутчэй перабудаваць работу станцый, узняць ролю МТС у кіраўніцтве калгасамі, дабіцца таго, каб яны ўнікалі ва ўсе галіны калгаснай вытворчасці. Чым хутчэй мы прылучым МТС да іх новых абавязкаў, тым больш паспяховая будзе наша работа па выкананню задач, пастаўленых вераснёўскім Пленумам ЦК КПСС.

Рашаючым пытаннем уздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі з'яўляецца ліквідацыя адсталасці і руціны ў калгаснай вытворчасці, укараненне ў сельскую гаспадарку дасягненняў навукі і перадавога вопыту. Мы не даб'емся высокіх ураджаяў і высокай прадуктыўнасці жывёлагадоўлі, калі ў гэтым годзе самым катэгарычным чынам не пакончым з грубейшымі парушэннямі агратэхнікі, якія дапускаюцца МТС і калгасамі ў апрацоўцы зямель, пакуль не забаронім высяваць насенне ўручную, пры заніжаных нормах высеву, пакуль не будзем укараняць на кожным квадратна-гнездавую пасадку бульбы, не будзем ухадзіць за пасяўнінамі. Пытанні сельскагаспадарчыя органы павінны быць пастаянным прадметам штодзённай работы на першы план.

Рашаючай перашкодай на шляху да адсталасць у сельскай гаспадаркі, трэба павысіць ролю МТС, якія працуюць у галіне галоўных аграномаў МТС. Трэба выхоўваць нашых спецыялістаў у духу строгай патрабавальнасці і непрымірымасці да парушэнняў агратэхнікі, аказваць ім неабходную падтрымку.

Партыя і ўрад з мэтай асабістай зацікаўленасці калгаснікаў у далейшым развіцці жывёлагадоўлі і вырошчванні высокіх ураджаяў тэхнічных культур устанавілі рад заахвочвальных мер. Але бяда ў тым, што ў многіх калгасах нашай рэспублікі размеркаванне даходаў праводзіцца па прынцыпу ўраўнілаўкі, чым зніжаецца асабістая зацікаўленасць у калгаснікаў, іх ініцыятыва, штучна тармозіцца справа далейшага развіцця грамадскай гаспадаркі калгаса.

Рашаючым сродкам пераадолення буйных недахопаў, якія ёсць у сельскай гаспадарцы рэспублікі, з'яўляецца ўзмацненне арганізатарскай работы ў вёсцы па выкананню рашэнняў вераснёўскага Пленума ЦК КПСС. Кадрам, якія пасланы ў МТС і калгасы, цяжка будзе справіцца з вялікімі задачамі, ускладзенымі на іх, калі Совет Міністраў, Міністэрства сельскай гаспадаркі, мясцовыя совецкія і сельскагаспадарчыя органы не будуць своечасова вырашаць практычныя пытанні сельскай гаспадаркі. Гэтых пытанняў многа. Сярод іх найбольш вострым з'яўляецца забеспячэнне МТС машынамі па ачыстцы зямель, нарыхтоўцы торфу, абсталяваннем для механізацыі жывёлагадоўчых ферм, для арганізацыі водазабеспячэння, забеспячэнне калгасаў абознымі, рымарскімі вырабамі і іншым сельскагаспадарчым інвентаром. Совет Міністраў займаўся гэтай справай недастаткова актыўна.

У пытаннях забеспячэння мы часта сустракаемся з пэўнымі цяжкасцямі, выкліканымі абмежаванымі рэсурсамі і фондамі на метал, скураныя тавары, лямец, лес, дахавыя і іншыя матэрыялы. Трэба, каб больш актыўна выкарыстоўваліся для гэтага магчымасці на месцах. Аднак мясцовыя совецкія і сельскагаспадарчыя органы праяўлялі беспрынцыповасць у вырашэнні гэтых пытанняў і да сучаснага моманту не арганізуюць выраб неабходнага інвентару ў саміх МТС і калгасах.

Совет Міністраў БССР, вырашаючы пытанні сельскай гаспадаркі, не праводзіў неабходнай арганізатарскай работы па выкананню рашэнняў, слаба развіваў ініцыятыву мясцовых работнікаў, знаходзіўся ў палоне папер. За перыяд пасля вераснёўскага Пленума ЦК КПСС Совет Міністраў прыняў 127 пастаноў па пытаннях развіцця сельскай гаспадаркі. Распрацоўка гэтых пастаноў і абмеркаванне іх адабралі ў нас многа часу. Але Совет Міністраў не правёў неабходнай арганізатарскай работы па

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ПРЕЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Заканчэнне прамовы тав. К. Т. Мазурава

выкананню гэтых рашэнняў, па кантролю за іх ажыццяўленнем. Бескантрольнасць абумовіла безадказныя адносіны да дырэктыў з боку мясцовых совецкіх органаў, з боку Міністэрства сельскай гаспадаркі.

Міністэрства сельскай гаспадаркі не перабудавала сваю работу ў духу патрабаванняў верасняўскага Пленума ЦК КПСС. У рабоце Міністэрства недастаткова арганізаванасці, многія важныя дырэктывы выходзяць з міністэрства нават без ведама міністра і яго намеснікаў.

Калегія Міністэрства сельскай гаспадаркі як калектыўны орган кіраўніцтва з верасня мінулага года па студзень гэтага года, у самы гарачы перыяд арганізацыі выканання рашэнняў верасняўскага Пленума, па сутнасці не працавала. [illegible] штодзённай арганізатарскай работы на [illegible] месцах, у МТС і калгасах. Міністэрства сельскай гаспадаркі завалілася [illegible] раўленні, МТС і калгасы [illegible]

Выкананне задач [illegible] ўсіх галін сельскай гаспадаркі [illegible] карэннага паляпшэння работы Савета[illegible] работу райвыканкомы. У [illegible] ваны ўпраўленні сельскай гаспадаркі як непатрэбныя, зжыўшыя сябе органы. Цяпер кіраўнікам райвыканкома прыдзецца часцей бываць у МТС і калгасах, асабіста вывучаць справу на месцах. Гэта ўскладняе работу старшыні райвыканкома, але прынясе вялікую карысць справе. Трэба зрабіць больш аператыўным, жывым і канкрэтным кіраўніцтва калгасамі і МТС з боку мясцовых совецкіх органаў. Мясцовыя Советы праз свае выканаўчыя органы, праз пастаянныя камісіі павінны весці глыбокую арганізацыйна-масавую работу сярод спецыялістаў сельскай гаспадаркі, механізатараў і калгаснікаў, мабілізуючы іх на выкананне вытворчых планаў і ліквідацыю недахопаў.

Неабходна рашуча палепшыць работу Советаў як самай масавай арганізацыі працоўных, як школы практычнага навучання мільёнаў грамадзян кіраванню дзяржавай. На нарадзе старшынь райвыканкомаў адзін са старшынь выказаўся ў тым сэнсе, што сельскія Советы, маў, не павінны займацца МТС і калгасамі таму, што імі займаюцца вышэйстаячыя органы. Гэта няправільна і шкодна, гэта не што іншае, як недаацэнка ролі Советаў. Совет—поўнапраўны гаспадар на сваёй тэрыторыі. Ён павінен кіраваць усім гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, сачыць за выкананнем законаў і рашэнняў [illegible] Урада. Масавая работа Советаў [illegible] выкананню дзяржаўных і гаспадарчых [illegible] садзейнічаць паляпшэнню [illegible] калгасаў. Ды і для саміх Со[illegible] [illegible] года. Чым шырэй удзел [illegible] Советаў, чым больш [illegible] ейшысь, чым вышэй і [illegible] крытыка і самакрытыка ве[illegible] Советаў, тым менш бю[illegible] кіты і ў Советах і ў гаспадарчых арганізацыях, тым больш паспяхова выконваюцца планы развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі. У апошні час партыйныя арганізацыі пачалі менш удзяляць увагі сельскім Советам. Трэба ўзмацніць кіраўніцтва сельскімі і раённымі Советамі, падмацаваць іх кадрамі і дабіцца значнага павышэння ўзроўню іх работы.

Няма сумнення ў тым, што Цэнтральны Камітэт КПБ здолее мабілізаваць усю партыйную арганізацыю рэспублікі, Советы, усіх працоўных на паспяховае выкананне задач комуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ